*Вы обнажили то, что закрыто обыденностью — становой хребет — из хряща он или из железа!*

*Левчук, Ивановский, Василевич — это вот действительно люди, это хребет народа. Я завидую им. Я гляжу им в глаза.*

*Вы глубоко копаете, очень глубоко. Так и надо. Несмотря на трагичность, через пронизывающие всё конфликты в Ваших произведениях бьет струя жизненной уверенности и силы, выболенного, выстраданного оптимизма, оптимизма жить через всё. Вот именно что — дожить до рассвета!*

*Для меня примером Ваше величие духа, несгибаемость — ибо за произведениями — Вы сами.*

*Пишите, пишите, копайте глубоко и много! Для моего поколения это вот так нужно!*

*Вы просто обязаны писать! Это сейчас очень-очень нужно.*

*Еще раз Вам мое большое спасибо за то, что уже прочно вошло и никогда не изгладится у меня. Один из Ваших верных читателей — Растянников Павел.*

В публикации использованы письма из домашнего архива писателя. Печатаются с согласия Ирины Михайловны Быковой.

**Подготовил Сергей Шапран**



Анатоль ГАТОЎЧЫЦ

# Споведзь самотных самасёлаў

**Вёску Савічы Брагінскага раёна вырашылі «ажывіць» пасля чарнобыльскай катастрофы самасёлы. Праз нейкія два гады пасля адсялення сюды вярнуліся блізу дзвюх сотняў чалавек — прыкладна чацвёртая частка колішніх жыхароў. Знаходзілі тут прытулак і людзі з «гарачых кропак» былога Савецкага Саюза.**
**Наведаўшы Савічы ў сярэдзіне 90-х гадоў цяпер ужо мінулага стагоддзя, беларускі прэзідэнт агучыў новы падыход да пражывання суграмадзянаў на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях: «Хочаце жыць — жывіце!» І загадаў даць у падмогу самасёлам трактар і камбайн.**

## «Цяжка, што людзей няма»

Мінула дзесяцігоддзе, і жыццё расставіла ў Савічах свае акцэнты.



Марыя Гаўрыленка

Зарастаюць быльнягом вуліцы ды агароды. Вясковая крама, куды заходзіў кіраўнік дзяржавы, даўно закрыта. Са ста васьмідзесяці колішніх самасёлаў у Савічах цяпер засталося толькі 59 чалавек.

Сямідзесяцігадовая бабуля Марыя Гаўрыленка скрушна апавядае:

— Ох, галубчык мой, салавейка мой, жывецца цяжка. Таму, што людзей няма. Паўміралі людзі… Пасеялі за хлеўчуком бульбу, дык прыйшлі дзікі і палову сотак зрылі. Раней усё наваколле людзі засявалі, а цяпер пустуе зямля, быллём парасла. Хоць бы траву які трактар скасіў, каб не было такой глушы. Ласкі просім, каб пакасілі касілкамі, каб дзікі так нахабна тут не гойсалі.

Да чарнобыльскай катастрофы Марыя Дзям'янаўна з сям'ёй жыла ў Пучыне, непадалёк ад Савічаў. Перасялілі іх у саўгас «Камінтэрн» Буда-Кашалёўскага раёна, дзе радыяцыі таксама хапае. Хіба толькі стронцыю крыху меней.

— Калі мы жылі ў тым «Камінтэрне», у пасёлку Шырокім, я крыху расшорхалася, узяла вядро і выправілася ў Салаўёўку. Гэта вёска за тры кіламетры ад нас. Яе выселілі, а плантацыі клубніцаў там засталіся. Прыйшла я туды, стала ягады збіраць. Набрала амаль вядро. І тут прыязджаюць нейкія вайскоўцы. Пытаюцца: «Матуля, навошта вы тут клубніцы збіраеце?» А я ім адказваю, як ёсць: «Ягад захацелася». — «Нельга тут збіраць, радыяцыя вялікая». Я здзівілася, кажу: «Нас жа прывезлі сюды як у чыстую зону!»

Вайскоўцы паўсміхаліся і расказалі, што іх перавялі ў Буда-Кашалёва, каб вёскі ачышчаць ад радыяцыі.

Гэты расповед Марыю Дзям'янаўну вельмі ўразіў. Ягады яна не выкінула, прынесла дамоў і наелася ад душы. Але з таго часу глядзець на іх не можа, тым больш пасля перанесеных трох аперацый.

Вядро заражаных радыяцыяй трускалак было апошняй кропляй у рашэнні Марыі і яе мужа вярнуцца на Брагіншчыну. Іхні сын, які жыве ў Камарыне і працуе вадзіцелем, адвёз немудрагелісты бацькоўскі пажытак у пустую хату ў Савічы, бо ў родны Пучын, моцна аздоблены стронцыем, людзі не вярталіся.

### Адступленне першае

*Вёска Савічы вядомая з XVI стагоддзя як паселішча ў Рэчы Паспалітай. Гэта 152 кіламетры на паўднёвы захад ад Гомеля і 22 — ад Брагіна.*

*Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай у 1793 годзе Савічы разам з іншымі населенымі пунктамі адышлі да Расійскай імперыі.*

*На пачатку XX стагоддзя ў Савічах было 127 двароў і*


Рыгор Гутнік

ні парадзелых паселішчаў, ні заўчаснага адыходу з жыцця многіх аднавяскоўцаў, асабліва мужчын. Ужо дайшло да таго, што сярэдняя працягласць іх жыцця ў некаторых чарнобыльскіх раёнах ледзьве перавышае 57 гадоў. А колькасць сельскага насельніцтва, напрыклад, у тым жа Брагінскім раёне за апошнія дзесяць гадоў скарацілася ўдвая, нягледзячы на прыезд перасяленцаў з Расіі, Казахстана, Сярэдняй Азіі.

У свайго цёзкі Котчанкі я пацікавіўся, чаму ён усё-такі вярнуўся ў Савічы з вёскі Дуравічы, што ў Буда-Кашалёўскім раёне.

— Дык клімат не падышоў, — знайшоўся Анатоль і распавёў, што «клімат» той — сямейны.

У Савічы вярнулася і маці Анатоля, якой цяпер 83 гады. Так і жывуць. Анатолю няма яшчэ шасцідзесяці, але ён ужо на пенсіі: раней працаваў у радыяцыйна-экалагічным запаведніку, дзе стаж у паўтара разы апярэджвае звычайныя каляндарныя гады.

— Зямлю мы, як і раней, засяваем бульбай, жытам, ячменем, буракамі, памідорамі, гарбузамі і нават кавунамі. Яны тут растуць! — сцвярджае Котчанка.

Вырашчаны ўраджай ніхто не правярае.

— Не павязу ж я бульбу ў Брагін, — кажа Анатоль. — А да нас санстанцыя прыязджае правяраць найперш малако. Карову мы не трымаем, таму нічога і не правяраем. А што правяраць, калі чыстай прадукцыі ўсё адно няма.

Дарослыя працаздольныя жыхары Савічаў мараць пра якую-небудзь працу, бо, апроч участка лясніцтва, у вёсцы няма ніякай вытворчасці, а да калгаса — дваццаць вёрст.

— Тут у нас адны пенсіянеры. Таму дапаможаш прапалоць, гэтаму — узараць, і кожны капейку дасць. Купіш

*812 жыхароў. Тут дзейнічалі народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, капліца, яўрэйскі малітоўны дом, дзве лаўкі, карчма.*

*У 1930 годзе ў Савічах заснавалі аднайменны калгас. Вяскоўцы тады мелі два ветракі, крупарушку, паравы млын, кузню, ваўначоску, стальмашню.*

*Найлепшы дэмаграфічны перыяд прыходзіцца на канец 50-х гадоў, калі ў Савічах жыло 1305 чалавек.*

*Падчас чарнобыльскай трагедыі ў Савіцкай сярэдняй школе, наколькі памятаю, размяшчаўся штаб унутраных войскаў. На ўзлеску адразу за вёскай трактарным плугам прааралі глыбокую баразну — мяжу 30-кіламетровай зоны. Вайскоўцы паказвалі тады ахоўную сістэму «зоны» кшталту той, якую выкарыстоўвалі памежнікі. Тонкі медны дроцік на метр ад зямлі цягнуўся ўздоўж баразны. Калі хтосьці разрываў яго, сігнал «трывога» паступаў на пульт. Але мясцовыя жыхары без асаблівых цяжкасцяў прабіраліся ў «зону» — хто за рэчамі, кінутымі паводле патрабаванняў начальнікаў, а хто і за харчовымі прыпасамі ды самагонам.*

*Адзін са сталых жыхароў вёскі Крукі распавядаў мне ў 86-м годзе, што ў Айчынную вайну ён пасты немцаў ды паліцаяў праходзіў, а свае ахоўнікі — тым больш не перашкода.*

Марыя Гаўрыленка згадвае: калі яны вярнуліся з саўгаса «Камінтэрн» у Савічы, да іх неўзабаве прыехаў кіраўнік дзяржавы.

— Лукашэнка быў у нас тутака. Даў новы трактар і камбайн. Але тэхніку адразу ў калгас забралі.

Цяпер вяскоўцы шукаюць прыватнікаў з канём альбо якой тэхнікай, каб тыя дапамаглі ім апрацаваць агароды, сабраць збажыну. Бо да калгаса ў Хракавічах, куды далучылі Савічы, ажно два дзесяткі кіламетраў.

Больш шанцуе тым, у каго родныя альбо сваякі працуюць у Палескім радыяцыйна-экалагічным запаведніку, дзе ёсць свая тэхніка. Астатнія спадзяюцца хіба на Рыгора Гутніка з суседняй вёскі Савічы Двор і ягоную працавітую кабылку. Ён і ўзарэ, і пабаранує, і бульбу абгоніць.

— Калі мы вярнуліся сюды, — згадвае Марыя Дзям'янаўна, — тут усё засявалі. А цяперака на ўсю вуліцу толькі тры хаты жывыя. Во тут, праз дарогу, жыла такая ж адзінокая бабуля, як і я цяпер, без гаспадара. Памерла, небарака, дык, мусіць, на трэці дзень спахапіліся, што яе няма. Сталі шукаць дзяцей, дык тыя ўжо прыехалі і пахавалі.

## «Чорт нас не бярэ»

У Савічах, як і ўсюды ў чарнобыльскіх вёсках, людзі прызвычаіліся жыць сярод радыяцыі. Але амаль ніхто з вяскоўцаў не ведае ні яе прыроды, ні нават дапушчальных узроўняў радыяцыйнага забруджвання прадуктаў харчавання, у тым ліку лясных грыбоў і ягад.

— Няма ніякага чорта, ніякай радыяцыі. Вунь тыя, што паехалі ў чыстыя зоны, даўно ўжо адчэзлі. А мы тут жывем, і чорт нас не бярэ. Мы ўжо адаптаваліся да радыяцыі, — кажа вясковец Анатоль Котчанка.

І гэтак разважаюць многія, нібыта і не заўважаючы ўсяго таго, што адбываецца побач:

хлеба (*смяецца*) альбо шмотку якую — так і перабіваемся, — апавядае 47-гадовы Рыгор, адзін з дванаццаці вясковых мужыкоў працаздольнага ўзросту.


Унукі Івана Анапрыенкі

## Адступленне другое

*З калегамі-журналістамі мы заўважылі, што ў радыяцыйных вёсках з ліку дарослага працаздольнага насельніцтва засталіся жыць пераважна людзі з паламаным лёсам. У аднаго не склалася сям'я, у іншага — з працай былі праблемы.*

*Багата людзей, якія моцна пілі і цяпер не перастаюць гэта рабіць, калі, канешне, яшчэ могуць. Аўталаўкі спраўна возяць у «зону» не толькі хлеб, макароны, цукар, але і гарэлачныя вырабы. Зрэшты, хто-кольвечы і сам здольны наладзіць вытворчасць «карчоўкі», як называюць іншым разам цукровую самагонку.*

*І з амурнымі справамі ў чарнобыльскіх вёсках асаблівых праблем таксама няма: недзе — развёўся, тут — сышоўся.*

*Адзін з маладых савіцкіх мужыкоў, дом якога застаўся за калючым дротам у Новым Сцяпанаве, пасля яўнага пахмелля бег за сваёй «палавінкай»: «Люда, пастой! Люд...» Нам ён расказваў: «Гэта маёй роднай жонкі родная сястра».*

*«Родная жонка», як высветлілася, засталася ў Гомелі, а «родная сястра» — у Савічах.*

Побач з дарослымі жывуць у Савічах і чацвёра дзяцей.

У Аляксандра і Ірыны Анапрыенкаў іх двое: чатырохгадовая Ніна і двухгадовая Аксана. Часцяком сюды прыязджае таксама з выселенай вёскі Грушнае і сын Аляксандра ад першага шлюбу, 12-гадовы Дзіма.

Даглядае дзяцей часцей за ўсё дзед Іван. Дзеці босыя і голыя растуць, як кажуць, на ўлонні прыроды, харчуюцца, як і дарослыя, найперш з агарода.

Дзед Іван скардзіцца, што меншая ўнучка вельмі не любіць купацца — ні ў начоўкаў, ні ў дажджавых лужынах. З большымі — лягчэй: «У гразі купаюцца. Дождж пройдзе, дык у лужынах. Раней — у начоўках, у балеі. Няхай плаваюць».


Канцэрт у Савічах

## Адступленне трэцяе

*Пакуль мы гутарылі з самасёламі, у Савічы прыехаў канцэртны аўтобус з Брагіна. Культурніцкі дэсант прывезла галоўны спецыяліст райаддзела культуры, яна ж кіраўнік галіновай інфармацыйнай групы Любоў Дубадзел.*

*— У раёне сёння паводле плана — адзіны інфармацыйны дзень. Раскажам пра апошнія падзеі ў нашай краіне і адначасова парадуем — канцэрт прывезлі, — патлумачыла Любоў Аляксандраўна.*

*На пустыннай вуліцы пачалі збірацца самасёлы. Некаторыя кабеты нават апранулі святочную вопратку. Бо канцэрт для іх — сапраўды свята.*

*Карцела, канешне, даведацца, пра якія такія падзеі ў краіне будзе распавядаць інфармацыйная група.*

*— Пра ўдасканаленне сістэмы льгот раскажам, — задаволіла цікаўнасць культасветніца.*

*Канешне, афіцыйная прапаганда людзям не расказвае, што за апошнія гады на Гомельшчыне паводле пастановаў*

*урада «чыстымі» альбо з «меншым узроўнем» радыяцыйнага забруджвання сталі больш за 200 паселішчаў. Таму іх жыхароў, у тым ліку і дзяцей, пазбавілі сацыяльнай падтрымкі з боку дзяржавы. Многія населеныя пункты выведзены з катэгорыі абавязковага адсялення, састарэлыя людзі страцілі магчымасць выехаць са сваіх пакінутых вёсак, напрыклад, у аграгарадкі ці раённыя цэнтры.*

*Тым часам савіцкім самасёлам паказалі некалькі канцэртных нумароў, пагрузіліся ў аўтобус і накіраваліся ў Грушнае.*

### Воўчы клык

Не абышла бокам самасёлаў Савічаў і адна з бедаў, што пачасцілася ў чарнобыльскіх вёсках. Асабліва ў тых, што прылягаюць да Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Сюды нярэдка забягаюць ваўкі, часам шалёныя, і нападаюць на людзей.

Тое было ўзімку 2006 года. Кацярына Чэчка выправілася па хлеб у суседнюю вёску Савічы Двор. Шалёны воўк напаў на пенсіянерку.

— Клянуся вам Богам, я не памятаю, як прыйшла дадому, — расказвае жанчына. — Вунь і спадніца мая, і куртка пракусаныя. Калі б гэта было летам і я была лёгка апранутая, ён бы мяне на месцы разарваў. Воўк мне на галаву ўскочыў — і па галаве лапамі… Я ў кювет павалілася. Ён нада мною стаяў, а я пуховай хусткай твар закрыла і крычала немым голасам. Воўк, пэўна, спужаўся майго крыку.

Драпежнік парваў жанчыне адзенне, параніў плячо, іншыя часткі цела — і збег. А неўзабаве ля крамы ў вёсцы Савічы Двор воўк напаў на старэнькую бабулю і моцна параніў ёй твар. Спатрэбіліся складаная хірургічная аперацыя і лячэнне ад шаленства.

У Савічах мне сказалі, што не так даўно бабуля гэтая памерла.

### Адступленне чацвёртае

*Кіраўнік Брагінскага таварыства паляўнічых і рыбаловаў Фёдар Бабранок распавёў, што, па ўсім відаць, і пенсіянерак, а затым яшчэ і маладога мужчыну, пакусала шалёная ваўчыца. Прынамсі, такую ваўчыцу забілі на тэрыторыі калгаса «Агра-Лідэр».*

*Паляўнічым і ветслужбе давялося нават у навакольных вёсках знішчаць хатніх сабак ды катоў, што мелі кантакт з шалёным зверам: «Якія жывёліны былі пакусаны, мелі кантакт з ваўкамі, тых мы знішчылі. Дзе ўсыплялі, дзе адстрэльвалі. Спалілі іх і содаю тое месца пасыпалі. Прафілактыку правялі. Дзякуй богу, пакуль ціха».*

*Як сведчыць паляўнічы, вельмі шмат ваўкоў развялося ў радыяцыйным запаведніку. Там спакойна, і яны пладзяцца даволі хутка. А з надыходам моцных маразоў цягнуцца бліжэй да чалавечага жытла.*

*Канцэнтрацыя пагалоўя драпежнікаў вядзе і да пашырэння сярод іх шаленства. На яго хварэюць вельмі часта як ваўкі, так і лісы. І тыя, і другія нападаюць на хатнюю жывёлу і людзей.*

У Савічах тым часам жанчыны засвоілі новую тактыку зімовых паходаў у краму.

— Колле, нажы пабяром ды ідзём, — расказвае ўжо знаёмая нам Кацярына Чэчка. — Па адной ужо не ходзім, баімося. Гуртам ходзім!

**Фота аўтара і Уладзіміра Дзюбы**

**Настасся ЗАНЬКО**

# Нататкі з летняй практыкі…

Нарэшце скончыліся тэлевізійныя штодзённыя зводкі з палёў. Хлеб сабраны. У агульным каравай ёсць лусты і скарынкі, «падабраныя» падчас «бітвы за ўраджай» у СПК «Вінец» Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Дзе ў час «змагання за хлеб» я сапраўды зразумела, чаму людзі кажуць: «Не хлебам адзіным»…
Я на зерняток пайду, хай мяне навучаць!

Лета — самы час падзарабіць для студэнта. Аптымальны варыянт — у родным горадзе ці вёсцы. І танней, і да бацькоў бліжэй. Не вельмі ж да іх з сталіцы наездзішся.

А паколькі ў нашай вёсцы амаль адзіным месцам сезоннага заробку з'яўляецца калгас (назва СПК неяк не прыжылася), то менавіта туды я і накіравалася. Мяне і яшчэ дзвюх такіх жа студэнтак узялі вагаўшчыцамі на зерняток. Праца не складаная: узважваць машыны з зернем, запісваць чыстую вагу ў спецыяльны журнал і рэестры вадзіцеляў і камбайнёраў.

Мае зменшчыцы працавалі не першы год. А вось мне горш за ўсё даваліся начныя змены. У маю будку (а інакш працоўнае памяшканне вагавай не назавеш) набівалася шмат народу.

Камбайнёры ішлі з паперамі, якія чамусьці завуцца рэестры. З гэтага года па новых правілах у «рэестрах» павінен быць мой подпіс. Увогуле, камбайнёры павінны самі пазначаць кожны рэйс вадзіцеля. Але на полі яны проста не паспявалі гэтага рабіць.

А начальнікі ўчасткаў прыходзілі, каб падсумаваць сабраныя за дзень тоны і (галоўнае) запісаць колькасць зжатых гектараў. Пасля я павінна была запоўніць спецыяльныя набытковыя ведамасці, каб ранкам здаць… Толькі пасля паўночы можна было крыху расслабіцца і паслухаць стары, яшчэ савецкі, радыёпрыёмнік з алюмініевым дротам замест антэны.

Вагавая падчас уборкі — гэта інфармацыйны цэнтр. Менавіта тут можна даведацца, колькі, чаго і адкуль было прывезена, хто колькі намалаціў за дзень. Заходзяць і проста так пасядзець, пагутарыць, паскардзіцца на жыццё. А калгаснае — яно малінай і лёгкімі грашыма не пахне.

# Грошы — зло. Заходзіш у краму, і зла не хапае

Колькі нам заплацяць, не сказалі. Ні ў пісьмовай дамове, ні ў размовах — ніякай інфармацыі. Пачалі працаваць за ката ў мяху.

Акрамя нас, студэнтак, на зернетаку дапамагалі роднаму калгасу і школьнікі. Вядома ж, не бясплатна. Працавалі яны толькі днём у дзве змены па шэсць з паловай гадзін. Розніцы для 14- і 16-гадовых не рабілася. Нягледзячы на тое, што паводле закону падлеткі ад 14 да 16 гадоў могуць працаваць не больш за чатыры гадзіны, а з 16 да 18 — не больш за шэсць пры аплаце на ўзроўні дарослых.

Удзень на таку дарослых рабочых не было, калі не лічыць дзвюх бабулек-пенсіянерак. Таму дзеці выкладваліся па поўнай праграме. Грузілі і разгружалі машыны (з дапамогай спецыяльных пагрузчыкаў). Былі выпадкі, калі школьнікі рабілі дарослую працу. Цягалі мяхі, напрыклад. Дый проста рыдлёўкай памахаць шэсць гадзін паспрабуйце!

Таму школьнікі справядліва настойвалі, што плаціць ім павінны больш. Праўда, абмеркаванне гэтай гарачай тэмы часцей вялося міжсобку, чым з начальствам.

— У мінулым годзе, — расказвае дзесяцікласніца Наталля, — абяцалі добры заробак, але атрымалі мы па 150 тысяч рублёў (гэта за паўтара месяца працы. — Заўв. аўт.). Нешта там накруцілі ў бухгалтэрыі. У выніку я і мая сяброўка атрымалі аднолькавыя грошы, хоць Ала прапусціла чатыры дні, а я ўсяго адзін. Ну, нейкая ж розніца павінна была быць?!

Зараз школьнікі спадзяваліся атрымаць больш грошай яшчэ і таму, што сын старшыні Славік таксама працаваў на зернетаку.

Калгасныя заробкі непакояць і дарослых. Калі для дзяцей гэта — сезонныя грошы, то для іх бацькоў — асноўны даход. І лета — якраз той час, калі можна зарабіць: «летні дзень год корміць».

Але гэта толькі так кажуць. Адзін летні сезон у СПК «Вінец» наўрад ці пракорміць не тое што год, нават месяц сям'ю даяркі ці механізатара, калі абое дарослыя працуюць у калгасе. За 10 тысяч рублёў у дзень (прычым улетку з 7.00 да 23.00 без выхадных) мінскі рабочы згадзіўся б хіба што адпачываць. А вось у «Вінцы» многія калгаснікі працуюць сапраўды цяжка за такія, а часам нават і меншыя грошы. Таму з калгаса і ўцякаюць.

## Свае і чужыя

Любоў Іванаўна, інжынер па тэхніцы бяспекі, адзначае, што звальненняў становіцца ўсё больш і больш.

— Ну, а што тут рабіць, — разважае яна. — Гэта мы, старэйшыя, трымаемся гэтага калгаса, бо трэба ж неяк да пенсіі дабыць. А вось ты скажы, з горада нехта вярнуўся назад? Не, я не кажу пра п'яніц. А з талковых? Не, не вярнуліся, бо што тут рабіць.

Сяргей, памочнік камбайнёра, скончыў пружанскі каледж і цяпер адпрацоўвае ўкладзеныя ў яго дзяржавай грошы. У калгасе заставацца не збіраецца.


Photo.bymedia.net

— Не, 1 жніўня 2008 года, на наступны дзень пасля заканчэння адпрацоўкі, я адсюль звалю, — кажа ён. — Ды хоць бы папрацаваць далі! Заробіш з імі… Ламаемся часта. Сёння ізноў некалькі разоў ланцуг на полі зляталў.

Але «зваліць» з СПК праблематычна. Кіраўніцтва замест павышэння заробку дзейнічае метадам умоў і перакананняў. Напрыклад Аляксандра, памочніка камбайнёра, не звальнялі некалькі тыдняў. Матывавалі проста: няма працаўнікоў.

— Кожны дзень да мяне падыходзіў шэф (так падначаленыя называюць старшыню. — Заўв. аўт.) і прасіў яшчэ некалькі дзён папрацаваць, пакуль яны, маўляў, працаўніка не знойдуць. А мне сюды з Бярозы ездзіць за гэтыя 400 тысяч. Я іх спакойна і ў горадзе зараблю, і выдаткаў будзе меней!

Акрамя сваіх, мясцовых, на зернетаку працавалі шабашнікі, «браты-украінцы». Па чутках, ім павінны былі заплаціць нашмат болей за мясцовых.

Чаму штогод такая несправядлівасць у дачыненні сваіх працаўнікоў? Няўжо чужыя сезоннікі лепшыя за пастаянных працаўнікоў, якія вось ужо колькі год працуюць у СПК? Адказы на гэтыя пытанні, думаю, цікавяць не толькі мяне.

Пэўна, такая палітыка нечым выгодная для кіраўніцтва калгаса. А «выгода» людзей, якія за няспынную сялянскую працу не могуць атрымаць належнага, каб нармальна жыць, увасобілася ў прыпеўкі і прыказкі, якія не транслююць па тэлебачанні. Адна з такіх прыказак уразіла мяне найбольш: «Каб у калгасе жыць у шчасці, трэба красці, красці, красці».



# Школа, настаўнік, родная мова

*...Ружавее ранні золак,*
*Рэха ў гаях,*
*А ў грудзях тваіх асколак,*
*Беларусь мая.*
*(Сяржук Сокалаў-Воюш, паэт, бард)*

**Ала КАЖЭРА,**
**педагог**

**Пачаўся новы навучальны год, і, хаця я, што называецца, даўно на заслужаным адпачынку, маё настаўніцкае сэрца не можа застацца абыякавым да таго, што адбываецца за сценамі школы. Я зноў думаю пра лёс роднай мовы, пра выхаванне нацыянальна свядомых сыноў і дачок нашай Радзімы, духоўную культуру і спадчыну беларусаў.**



Фота Анатоля Кляшчука

Часта даводзіцца чуць, што бацькі не хочуць аддаваць дзяцей у беларускамоўныя школы і класы.

Мне ж згадваецца пачатак 90-х, калі родная мова, дзякуючы намаганням дэпутатаў Вярхоўнага Савета 12-га склікання, быццам прачнулася ад цяжкага летаргічнага сну і пачала квітнець.

Перад вачыма сярэдняя школа № 96 г. Мінска напярэдадні навучальнага года. Бацькі без усякага прымусу пішуць заявы ў беларускамоўныя 1-я класы. Паўсюль чуваць беларускую гаворку, твары людзей радасныя, асветленыя. Такі ж настрой у большасці мінскіх школ.

Тады мова яднала людзей, адчувалася аднадушнасць бацькоў і настаўнікаў. Дзяржава заахвочвала тых, хто выкладаў па-беларуску, даплочвала 10 адсоткаў ад стаўкі.

Педагогі імкнуліся да авалодвання мовай, наведвалі розныя курсы, лекторыі, семінары. Настаўнікі беларускай мовы былі ў дэфіцыце, бо ў школах павялічылася колькасць гадзін на тыдзень.

Самы актыўны ўдзел у адраджэнні духоўнасці прымала Таварыства беларускай мовы пад кіраўніцтвам народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча.

У Савецкім раёне Мінска суполкай ТБМ кіраваў Алег Трусаў, па яго ініцыятыве на базе бібліятэкі імя Янкі Купалы стварыўся нядзельны беларускамоўны ліцэй. Кіраўніцтва бібліятэкі смела адгукалася на ўсе прапановы ініцыятараў адраджэнцкага руху.

Мне даверылі працу па стварэнні ліцэя, які хутка стаў самастойнай штодзённай навучальнай установай. Гэта быў пачатак усім вядомага сённяя ліцэя імя Якуба Коласа. Паралельна я ўдзельнічала ў стварэнні курсаў вывучэння беларускай мовы на базе СШ № 23 г. Мінска, а таксама семінараў для бібліятэкараў Савецкага раёна.

Цікавасць да ўсяго беларускага была незвычайная, бо з лекцыямі перад школьнікамі і студэнтамі выступалі вядомыя навукоўцы: Генадзь Сагановіч, Павел Лойка, Сяргей Тарасаў, Павел Церашковіч, Ігар Чарняхоўскі, іншыя. Настаўнікі і бібліятэкары, атрымаўшы пасведчанні ТБМ імя Ф. Скарыны, панеслі беларускае слова ў жыццё.

Прыгадваю развітальную размову з групай бібліятэкараў, сярод якіх шмат рускіх па нацыянальнасці, бо многія патрапілі ў Беларусь пасля замужжа:

— Шчырае дзякуй усім выкладчыкам, бо вы для нас адкрылі прыгажосць мовы, на якой мы нават баяліся і слова вымавіць.

Гэта было прыемна. Разам з тым карэнныя беларусы спяшаліся пазнаць, адкуль мы родам, дакрануцца да сваіх каранёў, да вытокаў, да мілагучнасці роднай мовы і вызначыць не толькі сваю будучыню, але будучыню Беларусі.

Хаця, здаралася, хтосьці прадказваў цяжкія часіны, калі ўсё раптам зменіцца і хмара цемрашальства зноў закрые далягляд пазнання. Так яно і адбылося, калі пасля 1994 года ўлада пачала ўносіць бясконцыя папраўкі ды змяненні ў Канстытуцыю краіны.

Заўважна паменшала беларускіх школ і класаў, пад нож пайшоў падручнік па гісторыі Беларусі, скарацілі колькасць гадзін навучання і адмянілі экзамен па беларускай літаратуры ў 11 класе. Лагічным вынікам «новага парадку» быў рэферэндум 1996 года: абвесцілі, быццам бы народ сам цураецца роднай мовы і прагне «великого и могучего». Пачалося адрачэнне ад святыняў: гістарычнай дзяржаўнай сімволікі, роднай мовы ў школах.

Лічбы гавораць самі за сябе:

— 1994/95 год — 58% школьнікаў навучаюцца на беларускай мове;

— 2000/01 год — 4,3% школьнікаў навучаюцца на беларускай мове;

— 1995/96 год — рускамоўных школ 79%;

— 2000/01 год — рускамоўных школ 91%.

Прывяду колькасць школьнікаў, што навучаліся на беларускай і рускай мовах.

| Навучальны год | па-беларуску | па-руску |
|---|---|---|
| 2000—2001 | 400869 — 29% | 1039174 — 70,9% |
| 2005—2006 | 280179 — 23% | 922938 — 76,7% |
| 2006—2007 | 245928 — 21,5% | 898615 — 78,5% |

За 13 апошніх гадоў прыём у першыя класы з роднай мовай навучання скараціўся з 76% да 18,6%, а ў сталіцы — да 2,2%. Бацькі, напалоханыя такім становішчам, думаюць пра далейшую адукацыю дзяцей у ВНУ і ўладкоўваюць іх у рускамоўныя школы.

А многія настаўнікі, звыклыя да армейскага падпарадкавання яшчэ з савецкіх часоў, зноў зазналі не менш жорсткі ідэалагічны ўціск. Школа разам з усім грамадствам стала ахвярай крыжацкага паходу, на шчыце якога знявага да настаўніцкай працы ды ўдушэнне вальнадумства. Невысокая заработная плата, невымерная нагрузка, бюракратычныя формы кіравання паставілі настаўніка на калені. Эканамічныя праблемы спарадзілі духоўны генацыд, што прывяло да звыклай абыякавасці і баязлівага маўчання.

Калі ў школе з'яўляецца настаўнік з іншым светаўспрыманнем, то ён хутка становіцца «белай варонай». Гэта ў лепшым выпадку, а ў горшым яго чакаюць цкаванне ды стварэнне невыносных умоў працы.

З прычыны ціску з боку адміністрацыі мінскія школы вымушаны былі пакінуць многія настаўнікі. Сярод іх таленавіты педагог Леанарда Мухіна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры, паэтэса, чалавек перадавых поглядаў Вера Буланда. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат. Паводле дадзеных Таварыства беларускай школы, за кароткі час пацярпелі больш як 60 настаўнікаў і выкладчыкаў ВНУ, і гэты спіс можна доўжыць.

На вялікі жаль, школамі часта кіруюць нацыянальна недасведчаныя людзі, што негатыўна адбіваецца на працы ўсяго педагагічнага калектыву.

У школах, дзе не вучаць думаць, дзе настаўнік адарваны ад грамадскіх падзей, і вынік працы адпаведны. Бо настаўніку проста неабходна пачуццё гістарычнай справядлівасці, які б прадмет ён ні выкладаў. Як, дарэчы, і веданне роднай мовы, культуры і педагагічнай спадчыны. А дзеці абавязкова адгукнуцца памкненнем сваіх чыстых душ, бо вераць настаўніцкаму слову, існасці ведаў, праўдзе і справядлівасці. Калі ж навучэнцы адчуваюць фальш, у іх душах нараджаецца абыякавасць.

Настаўнік мусіць рабіць высакародную справу абуджэння ў душах дзяцей любові да свайго роднага, да беларускасці пры любых абставінах. Як было падчас маёй працы ў СШ № 38, у педагагічнай гімназіі № 3 г. Мінска. Тут працаваў самаадданы калектыў выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры: Данута Астрэйка, Раіса Марчанка, Марыя Рунец, Марыя Берташ. Кожны іхні ўрок — гэта дзейства, дзе спалучаюцца веды і пачуцці, выхоўваецца імкненне да спазнання новага, а на занятках па літаратуры даюцца прыклады з самаахвярнага жыцця беларускіх пісьменнікаў.

Настаўнікі вучылі ўспрымаць сучаснасць праз падзеі мінулых часоў. Гэтаму спрыялі клубы «Вытокі», «Бусляня», дзе тыдні беларускай мовы і культуры ператвараліся ў запамінальнае свята. Два гады рэгулярна праводзіліся дыспуты «Моўны фактар як асяродак фармавання нацыянальнай свядомасці і гуманістычнага светапогляду».

Мы правялі апытанне праз сачыненне «Ці будзе жыць беларуская мова?».

«Я вельмі люблю сваю мову, але прызвычаілася да русізмаў, — напісала вучаніца шостага класа, — бо ўсе гавораць па-руску. Аднак веру, што прыйдзе час, калі беларуская мова будзе жыць і квітнець».

«Людзі, якія называюць сябе беларусамі, а самі і цікавяцца іншай мовай, і ставяць яе на першае месца, не заслугоўваюць гэтай назвы. Такіх людзей можна назваць «бежанцамі», якія ўцякаюць, бо пагражае бяда, а самі не маюць сілы супрацьстаяць знішчэнню. Гэта слабыя людзі, якія жывуць не сваім, а чужым» (11 кл).

З кіраўнічага «алімпа» неўзабаве павеяла холадам. Да настаўнікаў-адраджэнцаў пачалі ставіцца вельмі адмоўна. Пасля дыспута «Беларуская мова: ці надзённая сёння праблема?» я атрымала вымову за антыпедагагічныя паводзіны. Аднойчы на нарадзе сакратар абвесціла, што ўсім настаўнікам, акрамя мяне, падоўжаныя кантракты. Я вымушана была сысці з гімназіі.

У сярэдняй школе № 38, дзе я апошнія гады працавала, дзейнічала літаратурная майстэрня «Купалінка», у якой мы імкнуліся развіць літаратурныя здольнасці падлеткаў, абудзіць цікавасць да беларускай мовы, культуры, спадчыны.

У школе часта выступалі беларускія паэты: Мікола Маляўка, Сяргей Законнікаў, Мікола Чарняўскі, Васіль Жуковіч, гэтыя сустрэчы былі натхняльныя і запамінальныя.

Адначасова ў пачатковых класах працавала дзіцячая арганізацыя «Верасок». Як жа адгукаліся вучні на беларускае слова, як актыўна ўдзельнічалі ў літаратурных вечарынах, «Падарожжы па краіне беларусаў», эстафеце пакаленняў «Мой радавод».

Не, ніколі не паверу, што нашы дзеці нараджаюцца манкуртамі. Жыве ў іхніх душах жаданне пазнаць сваё, роднае, а калі настаўнік падае прыклад, вядзе за сабой, то гэтае памкненне становіцца шчырым і асэнсаваным.

Вось якія вершы складалі навучэнцы педгімназіі № 3:

*Беларуская мова — роднае слова,*
*Спеўнае, як і Радзіма мая.*
*Беларуская мова ляціць у прасторы —*
*Песня твая, думка твая.*

*(Таня Раманава, 6 кл.)*

---

*Беларусам не трэба чужога:*
*Ні дабра, ні парады, ні славы.*
*Мы не возьмем ад іншых нічога,*
*У нас Радзіма свая і дзяржава.*

*Мы маем Нясвіж і Гальшаны,*
*Талентаў ланцуг нестрыманы.*
*І Будны ў нас ёсць, і Прадслава.*
*Якое яшчэ вы жадаеце славы?*

*(Юрка Васілеўскі, 11 кл.)*

Так і ляжыць у мяне зборнік вершаў «Гімназічны ветразь». Але хто сёння паспрыяе яго выданню?

На працягу стагоддзяў настаўніцкая самаахвярнасць была невымернай, і ці маем мы зараз права скласці рукі перад дзікунствам і наступам на родную мову?

Справа выхавання чалавека не можа лічыцца скончанай, пакуль у настаўніка застаецца хаця б адзін шанец, бо яму дадзена вялікае шчасце бачыць свет вачыма дзіцяці.

Вядома, што паўнавартаснасць асобы залежыць ад маральнага выбару. Які выбар зробіць настаўнік, такі і пакіне след, бо ён працуе для будучыні. І не мае значэння, застануцца нашы імёны на скрыжалях гісторыі ці не. Галоўнае, што ў гэтай будучыні будзе часцінка нашай працы дзеля захавання роднай мовы і Радзімы.



Канстанцін СКУРАТОВІЧ

# Сёе-тое пра аўто для народа

Беларусь зрабіла БелКу, зарганізавала «Славянскі базар», досвед аграгарадкоў прапануе Венесуэле. Самы час здзівіць свет народным аўто.

І хоць у пасёлку Абчак пад Мінскам вырабляюць беларуска-іранскі «Саманд», на які пры старце праекта паабяцалі перасадзіць у першую чаргу сталічных чыноўнікаў і міліцыянтаў, ні мэр беларускай сталіцы, ні міністр унутраных спраў, ні тым болей прэзідэнт на іранскім «скакуну» не заўважаныя.

Бо краіна шукае варыянты.

## Гітлер меў «жука» ў крэдыт

69 гадоў таму, 26 мая 1938 года нямецкі інжынер Фердынанд Поршэ зладзіў прэзентацыю зараз вядомага ўсяму свету аўтамабіля «Фольксваген». Кіраўніцтва фашысцкай Германіі абрала мадэль для народнай аўтамабілізацыі краіны. Пэўным чынам то быў адказ «заакіянскім плутакратам» са Злучаных Штатаў, якія першымі ў свеце здзейснілі праект вытворчасці даступнага кожнаму рабочаму аўтамабіля маркі Генры Форда.

Праект «Фольксваген» таксама аказаўся паспяховым, але толькі праз дзесяць з лішнім гадоў, бо неўзабаве пачалася Другая сусветная вайна, у выніку якой гітлераўская Германія пацярпела жорсткую паразу.

Для вытворчасці Поршэ прапанаваў тры варыянты «жука»: лімузін, кабрыялет і цалкам адкрытае спартова-прагулачнае аўто. Ён меў рухавік магутнасцю ў 24 конскія сілы, спажываў 6–7 літраў бензіну на 100 кіламетраў і мог рухацца з хуткасцю да 100 кіламетраў у гадзіну, перавозячы акрамя шафёра чатырох пасажыраў.

Заводскі кошт машыны складаў 990 рэйхсмарак, «сярэдні немец» мог яе набыць дзякуючы сістэме спрыяльнага крэдытавання.

З цягам часу высветлілася, што канструкцыя «Поршэ» была ў многіх адносінах ледзь не геніяльнай, таму аўтамабіль, празваны «жуком» з прычыны знешняга падабенства, у 50-я гады мінулага стагоддзя павялічваў сваю папуляцыю з хуткасцю вельмі знаёмай беларускім калгаснікам дакукі — каларадскага жука.

Поршэ быў выдатным інжынерам, Гітлер, як высветлілася, — натуральным людажэрам, але перапляценне палітычных інтарэсаў аднаго і прафесійных памкненняў другога дало гэткі вось плённы вынік. Хоць Гітлер, які ў 1939 годзе стаў адным з першых уладальнікаў народнага аўтамабіля, пра пераможную хаду «жука» па Еўропе так і не даведаўся.

Дарэчы, кіраўнік той ваяўнічай Германіі не толькі прыняў удзел у прэзентацыі аўтамабіля для народа, але і набыў яго на тых жа ўмовах, праз тую ж сістэму спрыяльнага крэдытавання, што і шараговыя грамадзяне.



У Савецкім Саюзе аўто заўжды было раскошай, і «народным» стаў хіба «Запарожац», пра які дагэтуль гуляе шмат анекдотаў. У постсавецкі час Барыс Нямцоў, стаўшы расейскім прэм'ерам, паспрабаваў «пересадить на «Волги» нават не ўрадоўцаў, а шараговае чынавенства, але з гэтага нічога не атрымалася. Хоць пры Ельцыне «младарэфарматарам» многае дазвалялася і многае прабачалася, але такога замаху на свае собскія інтарэсы, хай сабе і дзеля захавання айчыннага аўтапрама, расейскія «вяршкі» не пацярпелі.

## Міжнароднік Бовін меў «Аку»

Пасля «Форда» і «Фольксвагена» ідэя стварэння ўласнага «народнага аўтамабіля» не пакідала кіраўнікоў розных краінаў. Былі паспяховыя праекты. У прыватнасці, італьянскі «Фіят», правы на вытворчасць якога на льготных умовах (пры садзейнічанні італьянскай кампартыі) атрымаў Савецкі Саюз. Кажуць, што італьянскія камуністы атрымалі ў «адкат» амаль законную грашовую падтрымку ад КПСС, але савецкая краіна займела адносна сучасны аўтамабільны завод, а савецкі народ — танны аўтамабіль. Адносна танны. На «Жыгулі» шараговаму савецкаму чалавеку трэба было адкладваць грошы некалькі гадоў запар, але чэргі на набыццё былі вялізарнымі.

Пазбаўлены канкурэнцыі на ўнутраным рынку, аўтазавод у Тальяцці амаль не клапаціўся пра змену мадэльнага раду і штампаваў «Жыгулі», якія пры фармальнай змене нумара ў прэйскуранце і праз дваццаць гадоў нагадвалі ўсё тую ж перанятую ад «Фіята» «капейку».

Дарэчы, на знешнім рынку савецкая «Лада» таксама не пакутавала ад канкурэнцыі — у рэкламных праспектах вызначалася: «Новы аўтамабіль па цане патрыманага».

І калі аднойчы Міхаіл Гарбачоў, наведаўшы волжскі аўтагігант, выращыў, што наспеў час вывесці «Жыгуль» на ўзровень сусветных узораў, з перабудоўшчыка рагатаў амаль што ўвесь вялізарны Савецкі Саюз. Бо шмат хто ўжо ведаў: у прыадчыненай Еўропе і ўжо не такой далёкай Амерыцы — іншы попыт і іншы густ.

Да таго ж не бачылі нашыя людзі ні Хрушчова ў «Запарожцы», ні Брэжнева ў «Жыгулях». Тыя нават не імкнуліся ўлезці туды, куды ўлазіў савецкі народ. Незалежна ад камплекцыі.

Наколькі мне асабіста вядома, з усіх больш-менш прыкметных савецкіх асобаў адзін толькі Аляксандр Бовін меў смеласць не прытрымлівацца чынавенскай моды. Адносна позна сеўшы за руль, адносна позна атрымаўшы пасведчанне кіроўцы, ён задаволіўся мікрамініятурнай «Акой», набытай напрыканцы перабудовы. Цяжка ў гэта паверыць, ведаючы, што Бовін быў чалавекам курпулентным, але ён сам пра гэта напісаў у сваёй кнізе (вельмі, дарэчы, цікавай!) «5 лет среди евреев и мидовцев, или Израиль из окна российского посольства».

## Нашы маюць «Мерседэсы», але хочуць мець «Кітай»

Кіраўнікі незалежнай Беларусі змушаны задавальняцца «Мерседэсамі». Бо сваіх легкавушак Беларусь дагэтуль не выраблала.

Але зараз сітуацыя можа змяніцца. Высілкамі ўрада і дзякуючы добрым стасункам з асобнымі азіяцкімі краінамі, у Беларусі наладжваецца вытворчасць кітайскіх ды іранскіх «іншамарак», якім нібыта наканавана роля беларускага «Фольксвагена» ды масавага службовага аўто.

Сёй-той не разумее сімпатый беларускага кіраўніцтва да кітайскіх ды іранскіх заканадаўцаў аўтамабільнай моды. Іншыя кажуць: брэнд — не галоўнае, абы аўто рухалася ды не ламалася. Кітайцы ж некалі, атрымаўшы ад СССР заводы па вытворчасці зброі, пацiснулі на рынку «прагрэсіўных ваяроў», нават брэн-



датрымальнікаў — большасць змагароў супраць імперыялізму (у тым ліку савецкага) паспяхова ваявалі «калашамі» менавіта кітайскай вытворчасці. А талібскія ўмельцы ўвогуле вырабляюць іх з дапамогай зубіла з рашпілем.

Да таго ж у свеце многае мяняецца. Тавары кітайскай вытворчасці сёння фармуюць «абавязковы асартымент» беларускіх крамаў. Літаральна гэтак — калі прыбраць кітайскае, дык паліцы апусцеюць. Застануцца хіба што маленькія, дзе месціцца ўсё, пазначанае шыльдай «зроблена ў Беларусі». Пералічыць — хапіла б пальцаў на руках. І параўноўваць нашу «бытавую электроніку» з кітайскай, тайваньскай ці малайскай — толькі настрой сабе псаваць.

Так што, можа, лепш закупіць на пробу, для вывучэння попыту, гэтых кітайскіх легкавікоў і не эксперыментаваць з шыльдай «зроблена ў Беларусі» над таварам, вартасцям якога свет даўно вызначыў крытэрыі?

**Фота Анатоля Клешчука**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

# Віталь Тарас: «Яшчэ раз спрабаваў асэнсаваць жыццё»

**Генадзь КЕСНЕР**

«Звыклае зло» — гэтак называецца кніга вядомага беларускага журналіста і публіцыста Віталя Тараса, якая ўбачыла свет дзякуючы праекту «Кнігарня «Наша ніва». Аўтар кажа, што яго ідэйным натхняльнікам стаў калега, рэдактар «НН» Андрэй Дынько.

Зборнік складаецца з апублікаваных у незалежным тыднёвіку «Наша ніва» эсэ і нарысаў Віталя Тараса, а таксама з твораў, яшчэ не вядомых шырокаму колу чытачоў. «Век газетнага артыкула ці эсэ нядоўгі. Нават калі газета — тыднёвік, публікацыя ў ёй жыве самае большае пяць дзён. Але, насуперак законам жыцця і журналістыкі, я спрабаваў пісаць для «Нашай нівы» хоць і актуальна, ды ўсё-такі маючы на ўвазе гэтак званыя «адвечныя тэмы», — прызнаецца аўтар.

Вядомы беларускі публіцыст Сяргей Дубавец у прадмове да кнігі піша: «Супрацьпастаўленне газетнага артыкула, які, нібыта, жыве тыдзень, і рамана, разлічанага на вечнасць, — умоўнае. Бывае і наадварот. Галоўнае, што і артыкул, і раман падпарадкоўваюцца агульным законам літаратуры… Беларускае грамадства сёння разрозненае настолькі, наколькі, бадай, не было ніколі… Публіцыстыка і эсэістыка ў сённяшняй літаратуры — жанры «недзяржаўныя» і «апазіцыйныя».

Сяргей Дубавец мяркуе, што зборнік эсэ Віталя Тараса раскрывае чытачу вочы на многія актуальныя праблемы: «Мы не маем адказаў, у якім грамадстве мы жывем, што за час на двары, часта няма таго, хто б уцямна табе распавёў, што адбываецца з Беларуссю. А тут чалавек з вялікім жыццёвым досведам, жывым розумам, з вялікім талентам асэнсоўвае, што адбываецца, і ў кнізе Віталя Тараса знаходзіш адказы на гэтыя пытанні».

Суровы назоў сваёй кнігі аўтар тлумачыць гэтак: «Ён перадае не тое што сутнасць тых з'яваў, якія мы бачым вакол нас, а саму атмасферу. Можа, націск трэба рабіць не на «зло», а на «ЗВЫКЛАЕ зло». Бо мы ўсе, на жаль, прызвычаіліся да таго, што зло пануе на кожным кроку. Але мне не хацелася б, каб гэта ўспрымалася як праява чорнага песімізму. Гэта свядомы праваакцыйны прыём. Калі нехта абурыцца: «Ну, як гэта так, якое можа быць звыклае зло?» — тады мая задача часткова выкананая».

У эсэ «12» Віталь Тарас разважае: «…Шчасця ўсё адно няма. Бо колькасць зла ў прыродзе не змяншаецца. Проста зло набыло іншае аблічча. У адных выпадках яно стала яшчэ больш нахабным і нахрапістым, у іншых — наадварот, больш вытанчаным і крывадушным… Нават калі зло атрымала татальную і пагалоўную перамогу, калі ты аб гэтым ведаеш і хоць бы адзін не згаджаешся з гэтым, значыць, бітва яшчэ не скончаная. Значыць, час можа спыніцца і насуперак усім законам фізікі павярнуцца назад».

Калі кніга прэзэнтавалася ў Беларускім ПЭН-цэнтры, сябрыжурналісты шчыра здзіўляліся: няўжо ў Тараса сапраўды толькі першая друкаванка? І выдавец Зміцер Колас, знаёмы з Віталем Тарасам з малых гадоў, быў перакананы, што аўтар мае за плячыма цэлы стос выданняў. «З маленства прага пісаць прысутнічала ў ім і вылівалася ў нейкія непасрэдныя, на той час дзіцячыя творы, — сказаў Зміцер. — Мы тады шмат чаго напісалі разам, у сааўтарстве. Але зараз я быў упэўнены, што ў Віталя ўжо шмат кніг! Настолькі вялікі рэзерв яго магчымасцяў, што, безумоўна, гэтая першая кніжка пацягне за сабой цэлую чараду новых твораў. Спадзяюся, што гэта будзе не толькі публіцыстыка, але і проза».

Сяргей Дубавец на гэты конт зазначыў: «У розных творцаў вельмі па-рознаму складваецца іх творчае сталенне. Нехта можа «адстраляцца» ў 19 гадоў, а нехта ўсё жыццё спее-спее і ў 50 гадоў пачынае прапаноўваць публіцы свае ўжо завершаныя кандыцыйныя творы. Яму за іх не сорамна, а нам гэта — каласальны набытак».

З выхадам першай кнігі Віталя Тараса павіншавала старшыня ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», сябрам якой аўтар з'яўляецца ад часу стварэння гэтай арганізацыі, Жанна Літвіна: «Я абсалютна шчыра радуюся кожнай новай кнізе, якую пішуць журналісты. Мяне ўразілі словы, якія ёсць на пачатку Віталёвай кнігі: «Яшчэ раз спрабаваў асэнсаваць жыццё». На маю думку, асэнсаванне атрымалася. Там столькі асабістага, патаемнага, што, магчыма, не кожны чалавек гатовы аддаць гэта на суд грамадскасці. А Віталю ўсё гэта ўдалося».

Кніга «Звыклае зло» выйшла накладам усяго толькі ў тысячу асобнікаў.

# VIII конкурс для журналістаў

# «Польшча — прыязная суседка Беларусі»

Пасольства Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь аб'яўляе VIII тур конкурсу для журналістаў:

**«Польшча — прыязная суседка Беларусі».**

У конкурсе могуць прыняць удзел журналісты, якія да 30 лістапада 2007 года вышлюць на адрас Пасольства РП копіі публікацый (у тым ліку змешчаных на інтэрнет-старонках), а таксама радыё- і тэлематэрыялаў (з указаным месцам і датай публікацыі) за 2007 год на наступныя тэмы:

- Сучасная Польшча;
- Супольная гістарычная спадчына Беларусі і Польшчы;
- Польскія органы самакіравання як падмурак рэгіянальнага дэмакратычнага развіцця;
- Роля сродкаў масавай інфармацыі і пазаўрадавых арганізацый у Польшчы;
- Польска-беларускае эканамічнае супрацоўніцтва;
- Польшча ў ЕС;
- Беларусы і палякі — падабенства і адрозненне;
- Еўрарэгіёны — шанец для польска-беларускага памежжа;
- Турызм — найлепшы спосаб узаемапазнання.

**Матэрыялы просім высылаць на адрас:
220034 Мінск, вул. Румянцава, 6
з пазнакай: «Конкурс».**